УДК 821.161.3:82-7

І.В. Мышкавец, навук. супр.
(Літаратурны музей М. Багдановіча, г. Мінск)

## НЕВЯДОМЫ ФЕЛЬЕТОН МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Максім Багдановіч – класік беларускай літаратуры, паэт, празаік, публіцыст, крытык. Вось ужо амаль стагоддзе вывучэннем яго жыцця і творчасці займаюцца навукоўцы-даследчыкі.

Найбольш актыўны збор творчай спадчыны М. Багдановіча пачаўся ў 1920-я гады, калі Інстытутам беларускай культуры рыхтаваўся да выпуску першы збор твораў, актыўную ролю ў гэтым адыграў А.Багдановіч, бацька паэта. Другі ўзлёт цікавасці да творчасці М.Багдановіча назіраецца пасля Вялікай Айчыннай вайны. Вялікі ўнёсак у справу пошуку і захавання спадчыны паэта зрабіла Н.Ватацы, якая знайшла невядомыя дагэтуль аўтографы і публікацыі М.Багдановіча ў беларускім і рускім друку. Сваю лепту ў справу багдановічазнаўства ўнеслі І.Саламевіч, В.Рагойша, В.Скалабан.

Пошукамі творчай спадчыны М.Багдановіча займаліся супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча і Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР, якія вялі працу па падрыхтоўцы выдання збору твораў пісьменніка. Матэрыялы, якія яны выявілі, увайшлі ў “Поўны збор твораў М.Багдановіча” (1992–1995 гг.). Большую частку гэтых публікацый складалі творы пісьменніка, падпісаныя крыптанімамі “Ив. Ф”, “Ив. Ф-лев”, “Ив Февр.”, псеўданімамі “Эхо”, “Иван Февралев”.

Такім чынам, у Поўны збор твораў Максіма Багдановіча (1992–1995 гг.) уключаны наступныя творы за подпісам “Эхо”: “После концерта Яна Кубелика” (“Голос”, 1909), “Калейдоскоп жизни” (“Голос”, 1913), “Колька” (“Голос”, 1913), “Преступление” (“Голос”, 1913), “Именинница” (“Северная газета”, 1914), “Чудо маленького Петрика” (“Голос”, 1915), “Башня мира” (“Заря”, 1915).

І вось новая знаходка, вывучаючы падшыўку газеты “Голос” за 1909 год, намі выяўлены фельетон “Международный чемпионат и ярославцы”, апублікаваны ў № 189 ад 17(30) кастрычніка 1909 года, і падпісаны “Эхо”.

На нашу думку, гэта яшчэ адзін празаічны твор Максіма Багдановіча, дагэтуль невядомы беларускім даследчыкам і шырокай аўдыторыі. Фельетон падпісаны псеўданімам “Эхо”, як і іншыя матэрыялы, якія публікаваліся ў яраслаўскай прэсе ў 1909 – 1915 гг., а зараз уключаны ў Поўны збор твораў Максіма Багдановіча. Акрамя таго, аналіз мовы і стылю паказвае падабенства твора “Международный чемпионат и ярославцы” з фельетонам “После концерта Яна Кубелика”. Тая ж замалёўка з натуры, па-майстэрску перададзеныя дыялогі і развагі, тонкі гумар. Твор размешчаны ў рубрыцы “Маленькі фельетон”, таму

можна адзначыць і палітычны падтэкст, і гумарыстычныя выпады ў бок некаторых расійскіх дзеячоў і, наогул, дзяржаўнага ладу.

У фельетоне ўзгадваецца Міжнародны чэмпіянат па французскай барацьбе, які праходзіў у той час у Яраслаўлі ў цырку Рудольфа Труцы, прадстаўніка сусветна вядомай цыркавой дынастыі. Гастролі цырка сапраўды сталі вялікай падзеяй для жыхароў горада, гэта можна прасачыць па газетных публікацыях. Амаль штонумар паведамляецца аб падрыхтоўцы горада да сустрэчы з дрэсіроўшчыкамі, наезнікамі і барцамі-атлетамі.

На першых прадстаўленнях цырка ў Яраслаўлі быў поўны аншлаг. Яркая пастаянная рэклама, разнастайныя бонусы, прызы і падарункі, абяцаемыя адміністрацыяй цырка, штодня прываблівалі яраслаўскую публіку. Міжнародны чэмпіянат па французскай барацьбе, які праводзіўся ў межах цыркавых прадстаўленняў, стаў своеасаблівай кульмінацыяй, лагічным завяршэннем яраслаўскіх гастролей.

У нататцы “Международный чемпионат и ярославцы”, апублікаванай у газеце “Голос”, № 189, ад 17(30) кастрычніка 1909 года, яскрава асвячаюцца менавіта гэтыя падзеі. Аўтар нататкі высмейвае саму сістэму цыркавых чэмпіянатаў, дзе кожны спартсмен можа назваць сябе чэмпіёнам якога-небудзь горада, мясцовасці альбо краіны, хаця насамрэч ім не з’яўляецца. Фельетаніст з лёгкай іроніяй надае барцам выдуманыя прозвішчы, ведаючы, што ў артыстаў часцей за ўсё гучныя імёны. Але падтэкст нататкі ўсё ж значна шырэйшы за просты кпін з цыркавога жыцця. На думку аўтара, цырк з яго наведвальнікамі (сярод якіх досыць разнастайная публіка) параўноўваецца з Расійскай імперыяй, толькі ў цыркавой краіне жыве “свабода слова” ў адрозненне ад дзяржавы.

Падводзячы вынік вышэйсказанаму, адзначаем наступныя факты: Максім Багдановіч у расійскім перыядычным друку падпісваў творы ўласным прозвішчам, псеўданімамі і крыптанімамі; пад псеўданімам “Эхо” ў 1909 – 1915 гг. ён апублікаваў апавяданні, фельетоны, казку ў яраслаўскіх перыядычных выданнях “Голос”, “Заря”, “Северная газета”.

Такім чынам, выяўлены фельетон “Международный чемпионат и ярославцы”, апублікаваны ў газеце “Голос” № 189, 17(30).10.1909 года падпісаны “Эхо”, з высокай доляй верагоднасці належыць Максіму Багдановічу. Гэты празаічны твор пашырае наш досвед аб пісьменніку, яго жыцці і творчасці, і, адпаведна, пашырае магчымасці пошуку новых матэрыялаў не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Польшчы, Украіне, Літве.